адмовы ад геаметрычнай дакладнасці. У гэтым ваганні можна нават назіраць пэўную цыклічнасць і яе распаўсюджванне на новыя і навейшыя віды мастацтва. Умоўна можна вылучыць тры асноўныя этапы.

На першым, даволі непрацяглым этапе адбываецца рацыяналістычнае засваенне і ўвасабленне дакладнай геаметрыі. У нейкім сэнсе гэта выпрабаванне магчымасцей новых выяўленчых сродкаў. На другім этапе рацыянальнае і ірацыянальнае ўраўнаважваюцца. Геаметрыя паступова губляе сваю самадастатковасць і падпарадкоўваецца вырашэнню задачы мастацкага вобраза. На трэцім этапе дамінуе ірацыянальны пачатак, які паступова набывае разбуральны характар. Пачынаецца заняпад мастацтва. У гэтых умовах звычайна і адбываецца змена стылю.

**А.А.Кемен,**
*суіскальнік кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## РОЛЯ НАРОДНА-ХРЫСЦІЯНСКАЙ ПАЭЗІІ Ў СУЧАСНАЙ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ ЎСХОДНІХ СЛАВЯН

Вучэбныя праграмы нават студэнтаў-філолагаў, якія вывучаюць фальклор, у апошняй палове XX ст. не знаёмілі з творамі народна-хрысціянскай паэзіі. Між тым духоўныя вершы — своеасаблівы стрыжань традыцыйнай народна-хрысціянскай паэзіі — уяўляюць цікавасць і як мастацкія творы, і як матэрыял для вывучэння гісторыі народнага мыслення. Яны адпавядаюць духоўна-маральным асновам хрысціянства.

Духоўныя вершы неаднародныя па тэматыцы і жанравых прыметах. У Старажытнай Русі і пазней духоўнае супрацьпастаўлялася свецкаму, таму што апошняе не мела адносін да боскага, прычым толькі ў хрысціянскім сэнсе. З сучаснага пункту гледжання да духоўнай культуры адносяць усе мастацкія каштоўнасці мінулага і сучаснасці, у тым ліку і фальклор. Але так было не заўсёды. Значная

частка твораў вуснай народнай творчасці не лічылася духоўнай. Казкамі або песнямі "людзі беса цешылі", губілі душу. Духоўныя ж вершы служылі для суцяшэння і выратавання душы чалавека. У народнай паэзіі па "сур'ёзнасці" на адным узроўні з духоўнымі вершамі знаходзіліся толькі быліны.

Крыніца духоўных вершаў — у хрысціянскай літаратуры, якая стала актыўна пранікаць на Русь пасля яе хрышчэння ў канцы X ст. Склад яе не абмяжоўваўся кнігамі Свяшчэннага Пісання і сачыненнямі айцоў царквы. Існаваў вялікі пласт некананічнай, не прызнаны афіцыйнай царквой літаратуры. Так, акрамя евангелляў ад Матфея, Марка, Лукі, Іаана, існавалі апакрыфічныя евангеллі ад Пятра, Фамы, Нікадзіма. Звесткі аб жыцці Багамацеры ў кананічных евангеллях вельмі скупыя. Узнікла шмат легендаў і паданняў аб яе жыцці. У першыя стагоддзі нашай эры пашырэння хрысціянства ствараліся шматлікія жыціі мучанікаў за новую веру і сцвярджаліся яе ідэалы. Ветхазапаветныя сказанні распаўсюджваліся не столькі праз Біблію, колькі праз вуснапаэтычныя зафіксаваныя пісьмова трансфармацыі яе сюжэтаў. Менавіта літаратура, якая ў значнай ступені адлюстроўвала шырокі і неадназначны погляд на хрысціянскія святыні, стала сюжэтнай базай духоўных вершаў.

М.Сперанскі ў гісторыі духоўнага верша вылучаў "старэйшы" і "малодшы" перыяды. "Старэйшая" група духоўных вершаў па крыніцах і мастацкай форме набліжаецца да старажытнай паэзіі: "Гэта духоўны верш пераважна апавядальнага, эпічнага характару, напрыклад верш аб Галубінай кнізе, аб Фёдары Ціронс, аб Ягоры Храбрым, аб Страшным судзе". Другая група — да іх М.Сперанскі адносіць псалмы і канты — знаходзіцца пад пераважным уплывам літаратурнай традыцыі.

Даследаванне В.Адрыянавай "Житие Алексея, человека Божия, в стародавней русской литературе народной словесности" (1917) застаецца неперавзыдзеным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па глыбіні і маштабнасці вывучэння сюжэтам, у тым ліку ў фальклорнай традыцыі беларускага і ўкраінскага народаў.

У савецкі час духоўныя вершы як адлюстраванне "рэлігійных перажыткаў" дзесяцігоддзямі заставаліся па-за даследчымі інтарэсамі фалькларыстаў.

Спалучэнне багаслоўскага, гісторыка-культурнага і фалькларыстычнага падыходаў уласцівае апублікаванай у Парыжы (1935) кнізе Г.Фядотава "Стихотворения духовные (русская народная вера по духовным стихотворениям)".

Абраны аўтарам "сумарны" метад дазволіў паказаць народную веру як структурна адзіную сістэму "народнай этыкі", якая складаецца з трох асноўных элементаў — рытуальнага, карытатыўнага (поўнага любові) і натуралістычна-родавага (звязанага з вобразам маці-Зямлі).

Паклаўшы пачатак рэлігійнай і каштоўнаснай мадэлі свету, выяўленай у духоўных вершах, Г.Фядотаў даў важны матэрыял для вывучэння фальклорнай традыцыі.

У традыцыйнай сістэме каштоўнасных арыентацый вядучае месца займае маральна-этычная праблематыка. Хрысціянскі маральны імператыў распаўсюджваецца на тэматычныя ўласцівасці апавядання (у духоўных вершах, напрыклад, этычнае — цалкам усё цудоўнае).

Даследаванне Г.Фядотава важнае для пераадолення методык, аднабакова арыентаваных на выяўленне ў фальклорных матэрыялах міфалагічных, дахрысціянскіх элементаў (Палескі этналінгвістычны зборнік. — М., 1983).

Праведзены 22—25 красавіка 1999 г. у Мінску IУ фестываль праваслаўных песнапенняў паказаў: духоўныя вершы актыўна выконваюцца як у традыцыйным асяроддзі, так і прафесійнымі спевакамі. У сучасным свеце дамінуючай функцыяй духоўных вершаў стала эстэтычная. Мастацкі свет духоўных вершаў — гэта свет цудаў (лячэнне хворых, уваскрашэнне, перамяшчэнне ў частцы прасторы ў снах, гаворачыя іконы і іншае), створаны Богам, святымі і героямі, набыты святасцю. Насычанасць мовы духоўных вершаў царкоўнаславянізмамі было

непазбежным. Гэта патрабавала зместу, запазычанага з рэлігійна-клерыкальнай сферы.

Сучасныя даследаванні (В.А.Бахцін, С.Е.Нікіцін і інш.) паказваюць, што, будучы стылістычна вельмі разнароднымі, заснаваныя на праваслаўнай традыцыі, духоўныя вершы адзіныя ў сістэме каштоўнасных арыентацый. Прасякнутыя ідэямі праваслаўя, вершаваныя апавяданні канцэнтруюць пачуцці слухачоў на тым, што заслугоўвае любові, што ўзвышанае і цудоўнае.

Ф.Селіванаў падкрэсліў, што "гісторыя рускага фальклору без духоўных вершаў таксама няпоўная, непаўнацэнная, як гісторыя рускай культуры без гісторыі праваслаўнай царквы". Навука ідзе наперад па шляху сістэмнага, у духу Г.Фядотава, аналізу, які ахоплівае дэталізацыю, кампазіцыйна-тэматычны склад, рэлігійны сэнс, жанрава-структурную паўтаральнасць. Гэта дазволіць вызначыць аб'ектыўны крытэрый фальклорнасці жанру, што прынцыпова значна для аддзялення ўласна духоўных вершаў ад літаратурных, па сутнасці, аўтарскіх апавяданняў, якія бытуюць у шматлікіх сектах, у тым ліку таталітарнага характару.

Патрабуе далейшай аспектызацыі вывучэнне зместу духоўных вершаў перш за ўсё ў плане вылучэння ўласцівых традыцыйнай культуры стэрэатыпных спосабаў вядзення і ацэнкі рэальнасці. Неабходна стварыць адпаведную даследчую методыку і выявіць у фальклорных тэкстах ментальныя ўстаноўкі калектыўнага творцы. Выяўленне ментальнасцей дазволіць глыбей ахарактарызаваць сацыякультурнае асяроддзе, у якім ствараліся і бытавалі розныя па тэматыцы духоўныя вершы.

Народна-хрысціянская паэзія ўсходніх славян мае вялікі творчы патэнцыял і магчымасці яго актывізацыі дзякуючы высокай вартасці мастацкай формы і зместу, адпаведнага рэлігійным каштоўнасцям.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ